# СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

**1. Вызначце, ці з’яўляюцца наступныя спалучэнні слоў словазлучэннямі. Адказ матывуйце.**

Пісаць прыгожа, добра дагледжаны, ціха і непрыкметна, буду працаваць, высокая тапаля, стаяў побач, менш за ўсіх, давайце адказваць, няхай прыкмеціць, самы лепшы, трыццаць чатыры, за вёскай, найбольш адказна, горай за ўсіх, смялейшы за сябра, сустрэўся быў, падвёз бы, для таго каб, нягледзячы на надвор’е, мужны чалавек, кожны з іх, другі ад дарогі, лес і поле, вельмі цікавы, на працягу дня, згодна з меркаваннем, тым часам як, сто дваццаць пяць, былі прыйшлі, спаў не накрываючыся, жаданне купіць, яго мары, іх дабрабыт, спадніца клёш, таму што, у сувязі з падзеямі, дык вось, важны для ўсіх, вельмі прыемна, пасля сустрэчы, разрасліся навокал.

**2. Выпішыце ў адзін слупок свабодныя сінтаксічныя словазлучэнні, у другі – несвабодныя фразеалагічныя словазлучэнні. Назавіце словазлучэнні, якія могуць выступаць і ў ролі свабодных, і ў ролі несвабодных. Прыдумайце з імі адпаведныя сказы.**

Зрабіць выгляд, зрабіць ласку, зрабіць лаўку, зрабіць фундацыю; доўгая песня, доўгая дарога, доўгі язык, доўгі тэрмін, доўгія рукі; пайсці ўгору, пайсці ў ягады, пайсці па хлеб, пайсці ў ход; воўчы след, воўчае мяса, воўчы білет; круціць носам, круціць галаву, круціць рукой, закручваць гайкі; жыць як набяжыць, жыць у кучы, жыць з рубля, жыць пры бацьках, жыць добра; сваімі сіламі, сваімі рукамі, сваім мазалём, сваім ходам, сваім сумленнем; жывая душа, жывы чалавек, жывыя кветкі, жывая размова; хлеб надламаць, хлеб адбіць, хлеб надзённы, хлеб цяжкі; белы свет, белая варона, белы шалік, белы грыб, белы цукар.

**3. Выпішыце сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні. Вызначце, чым выражаны кампаненты такіх словазлучэнняў.**

Шмат народу, хтосьці са студэнтаў, мяккі позірк, хутка бегчы, пяцёра коней, штосьці нязначнае,ісці подбегам, зроблены са снегу, само жыццё, стаў пісаць, працаваць без перапынку, спрабаваў паступіць, звон струны, рад паслухаць, гатоў пакланіцца, быў нішто, думаць пра блізкіх, (жанчына) з блакітнымі вачыма, шыць іголкай, станавіўся ўстрывожаным, прыселі адпачыць, (чалавек) высокага росту, жаданне паступіць, прыйшла аддзячыць, (матылёк) з прыгожымі крыльцамі, хацеў дапамагчы, адзін з нас, быў брыгадзірам, (хлопец) моцнага характару, (дзядок) гадоў пад дзевяноста, госці з Балгарыі, зусім чыста, бясконца рад.

**4. Пабудуйце простыя словазлучэнні з дадзенымі словамі ў ролі галоўнага і ў ролі залежнага кампанентаў. Вызначце від словазлучэнняў паводле марфалагічнага выражэння галоўнага кампанента.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гоман, смелы, шчаслівы, другі, крыўдна, вандроўка, кажух, перамагчы, жыта, пяць, цяжкасць, паступіць, лепшы, смялейшы, чыста, кожны, нехта, сшытак, недалёка, добра, вясёлы.

**5. Размяжуйце простыя і складаныя словазлучэнні.**

Стары дуб з гняздом, самая ціхая вуліца, найбольш адказны чалавек, шчыра сустрэць сяброў, сустрэць Новы год, клапаціцца пра сённяшняе і заўтрашняе, сустрэцца з сястрой і братам, жыць на шырокую нагу, навучацца песням і танцам, працаваць да сёмага поту, трывожная песня, расказваць цікава пра здарэнне, новы школьны будынак, адчыніць дзверы госцю, імклівае вызваленне ад захопнікаў, гучная каманда ўставаць, прыемная гаворка па-беларуску, дзіцячы клопат пра звяроў, небяспечны з'езд з гары, жоўты ліст дрэва, бясконцая шыр палёў, бегчы на злом галавы, паспяхова адпрацаваны матэрыял, бачыць на свае вочы, расці на лес гледзячы, цалкам нявырашанае пытанне, тэрмінова патэлефанаваць маці, выключна спрыяльныя абставіны, бясконца марыць пра шчасце, жыць душа ў душу, буду гаварыць праўду.

**6. Выпішыце з тэксту дзеяслоўныя словазлучэнні. Вызначце характар сінтаксічных адносін і від сінтаксічнай сувязі паміж іх кампанентамі.**

Ваўкі беглі наўскід, маладыя, прыгожыя, лёгкія ў сваёй дужасці. Яны быццам і не спяшалі. Ян здзіўлена глядзеў на іх. Бліскуча льснілася шэрсць. Ваўкі нібы слаліся над халаднаватым некранутым снегам, толькі з-пад лап лёгенька ўзвіваўся снегавы пылок.

Ян прыспешыў ходу. Снег запысаўся ў боты. З глухаватым адчаем Ян паглядзеў наперад. За полем густа ўставаў лес, над ім зелянелася стылае неба. Ва ўсім гэтым, снежным і марозным, было ўжо нешта вясновае, і яно востра пахла жыццём і маладосцю.

Ян паставіў у аўтамат поўны дыск, памацаў у кішэні кажушка гранату. Але холад, які шархнуў па скуры, калі ўгледзеў ваўкоў, не прайшоў: вельмі ж упэўнена, няспешна ішлі яны.

Ён заспяшаў подбегам, таксама малады і дужы. Ён выходзіў цэлы з сутычак не з такімі звярамі, якія мелі салдацкую трэніроўку і аўтаматы.

Ян адчуў, як пацёк па брывах пот, а да лесу заставалася яшчэ далекавата. Некранутае ляжала перад ім снегавое поле, роўна беглі па ім напярэсцікі ваўкі… Яны не спяшаліся, яны разлічылі сваю сілу надоўга. У яго пачынала рабіцца гарачым у горле ледзяное вечаровае паветра. Ян задыхаўся і ненавідзеў іх, іхнюю драпежную прыгажосць і ўпэўненасць. Рашэнне прыйшло імгненна. Ён спыніўся, завярнуўся да пагоні, падняў аўтамат, гатовы спыніць яе раз і назаўсёды…

(А. Жук)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**7. Выпішыце з тэксту іменныя і прыслоўныя словазлучэнні. Вызначце характар сінтаксічных адносін і від сінтаксічнай сувязі паміж іх кампанентамі.**

Ёсць надзвычай непаўторная паэзія ў асеннім полі, хоць на першы позірк здаецца яно пустое і панурае. Калі вясна вядзе на луг і нараджае жаданне гарэзліва весяліцца, бегаць, скакаць, а ўлетку цягне паляжаць на ўзлеску, то ўвосень хочацца ісці па палявых дарогах у бяскрайнюю далеч і … думаць. Не ведаю, як каму, а мне асабліва хораша ў асеннім полі. Нідзе думкі не плывуць так спакойна, так шырока, павольна, нідзе не з’яўляюцца такія эпічныя сюжэты, як на той бязлюднай палявой дарозе, на якой часта спыняеш на чым-небудзь прывабным свой позірк. Толькі дзіву даешся, адкуль гарэза-вецер мог нанесці столькі markmanознага лісця, што ім забіты ўсе каляіны. Здаецца ж, дрэў тут блізка няма.

У асеннім лесе таксама добра думаецца. Але думкі тут маюць зусім іншую форму: яны яркія, кароткія і хутка змяняюць адна адну. Можа, гэта таму, што ўсё навокал гарыць фарбамі згасаючага сонца – цёплымі фарбамі жыцця і змагання, якія заўсёды ўзбуджаюць. І шмат што перашкаджае спакойнай і павольнай плыні думак. Шуміць лес. Шамаціць пад нагамі лісце, дзіўным веерам – у тры бакі ад сябе – насыпала на яшчэ зеленаватую траву залатовак прыгажуня-бяроза. Лісце яе – ну, сапраўды, як тыя залатоўкі! А жыхары лесу? Адзін з іх усю дарогу суправаджаў нас сваім непаўторным спевам.

(Паводле І. Шамякіна)

**8. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны дапасаваннем. Вызначце формы і сродкі дапасавання.**

1. Усеўладная восень неадступна цікавала за апошнімі праявамі хмельнага летняга жыцця (І. Навуменка). 2. На горцы стаяў разбураны мураваны касцёл, на вуглу дзвюх тоўстых сценак якога атабарыліся буслы (А. Пальчэўскі). 3. Паветра стала цёплым і лагодным, а над далечамі балот і палёў звісла сінеча-смуга – адзнака цяпла і адлігі (Якуб Колас). 4. Усё поле было ўсыпана белымі кветкамі (В. Адамчык). 5. Уздоўж дзвюх сцен ішлі шырокія лавы (У. Караткевіч). 6. Беларусы ведаюць каля тысячы страў з бульбы (У. Караткевіч). 7. На ўсходзе возера Нарач злучаецца вузкім пралівам з возерам Мястра (В. Вольскі). 8. Васько ведаў, што зімнік гэты праклалі калгаснікі суседняга калгаса “Ранак” (А. Асіпенка). 9. Княгіня Звеніслава спала, звыкла падклаўшы пад шчаку далонь (У. Арлоў). 10. Кожны дзень прыносіў у пасёлак якія-небудзь навіны (І. Навуменка). 11. На плячы ў яго [Пахомыча] ляжала каса-літоўка (В. Хліманаў). 12. Часамі здаецца, што гэтай першай ваеннай восенню яшчэ ніводнага выраю на поўдзень не праляцела. Птушкі нібы пакінулі зямлю (Р. Няхай). 13. Нехта незнаёмы нясмела пастукаў у шыбу (І. Мележ). 14. Як светлы сон, успамінаецца тут матылiная ружовасць пялёсткаў, пчаліны звон і ласкавае сонца (Якуб Колас). 15. Шасцёра сыноў знакамітага князя-вешчуна Усяслава Чарадзея ўзбагацілі радавое дрэва полацкай дынастыі Рагвалодавічаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шматлікімі атожылкамі (У. Арлоў). 16. Нішто жывое не траціць цяпер дарэмна гэтых апошніх залатых дзянькоў (Р. Ігнаценка).

**9. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны кіраваннем. Вызначце формы і сродкі кіравання.**

1. Восень ужо заслала залацістым абрусам палі збажыны, злёгку пасерабрыла шаты разгалістых прыдарожных кустоў (І. Навуменка). 2. Павее ветрык – шурхнуць травы: няма ў ім ласкі, ні забавы (Якуб Колас). 3. Перадвераснёскія дні былі напоўнены прыемнымі клопатамі і хваляваннямі (У. Шахавец). 4. Без душэўнай чуласці, без любові да дзіцяці не можа быць выхавання (В. Вітка). 5. Іван запусціў руку ў скуранку і, не вымаючы адтуль буханкі, адламаў маленькі кавалак скарынкі (В. Быкаў). 6. Салаўя песнямі не кормяць (Прыказка). 7. Вушы ловяць церушэнне зор (М. Лынькоў). 8. Сляпога за правадыра не пашлеш (Прыказка). 9. Пра сваіх продкаў мы можам меркаваць па ўспамінах, апавяданнях бацькоў, дзядоў (Б. Сачанка). 10. Вера ў справядлівасць не пакідала нас (Р. Няхай). 11. Нянавісць да ворага расла ў байцоў з кожнай гадзінай (В. Быкаў). 12. Актыўнасць у вучобе заўсёды адрознівала дзяўчыну ад астатніх (Якуб Колас). 13. У песні чалавек найбольш поўна выяўляе сваю душу (У. Краўчанка). 14. Я вяртаюся ў тое радаснае і незабыўнае свята, калі да нас, пасляваенных падлеткаў, прыходзіў на стол хлеб (М. Чарняўскі). 15. Цяжка адарваць вочы ад казачнай прыгажосці (У. Мяжэвіч). 16. Я радаваўся звароту Кіма. Ён, здавалася, прынёс мінулае, радаснае… (І. Навуменка).

**10. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны прымыканнем. Вызначце характар сінтаксічных адносін паміж кампанентамі.**

1. Душа маці прагла ўвабраць у сябе душу свайго народа – яе весялосць і сум, яе радасць і гора (В. Вітка). 2. У нас хату часта будуюць талакою, з тоўстых і смалістых бярвенняў (У. Караткевіч). 3. Горача свяціла сонца, зусім па-летняму дрыжала сіняватая смуга над пыльнай дарогай, у кустах крушыны свісталі вясёлыя дразды (І. Навуменка). 4. Беларусь якраз адрозніваецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе (У. Караткевіч). 5. Буяла яшчэ на лугавінах зялёная атава, у палісаднічках наперагонкі хваліліся сваёй някідкай прыгажосцю жоўтыя вяргіні і астры (І. Навуменка). 6. У некаторых хатах да холоднай паловы была прыбудова, у якой спалі ў зусім нясцерпную спёку (У. Караткевіч). 7. З-пад шэрага паліто выглядвала вайсковая гімнасцёрка і штаны колеру хакі (А. Марціновіч). 8. Алесь ляжаў на ложку і слухаў, як па-асенняму злосна гуў за вокнамі вецер (П. Броўка). 9. Днём грэла зусім слаба (І. Пташнікаў). 10. Штаны галіфэ пасавалі да яго стройнай фігуры (Р. Мурашка).11. І не гасне нястомнае жаданне зазірнуць за заслону заўтрашніх дзён (Якуб Колас). 12. Сцежка дадому бегла вузенькай змейкай праз невялікі хмызняк (У. Караткевіч). 13. Чытанне лежачы прытупляе зрок. 14. У доме насупраць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спявалі (Я. Маўр). 15. Вага брута была нязначнай. 16. Маці, узяўшы капаніцу, пайшла на агарод акопваць бульбу (Б. Сачанка).

**11. Да словазлучэнняў падбярыце сінанімічныя і запішыце іх.**

Вядомы на ўсю рэспубліку, сядзеў поруч з маці, нагінацца да зямлі, ісці ля ракі, працаваць ад раніцы, не спаць ноччу, купіць бочку для капусты, часопіс за жнівень, плакаць з радасці, зірнуў у бок бацькі, ветлівы з дзецьмі, пераплыць раку, пайсці ў апенькі, сустрэліся пасля вячэры, вучыцца на інжынера, не выканаць з-за ляноты, ехаць на адпачынак, пайсці ў ягады, падобны да бацькі.

**12. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Складзіце з некаторымі (на выбар) сказы. Адзначце асаблівасці беларускіх форм.**

Два круглых стола, мягкий по характеру, товарищ по институту, ехать за земляникой, три высоких стены, в двадцати шагах от дороги, пять интересных книг, бабушке – около семидесяти, идти по дорогам, ориентироваться по солнцу, благодарить товарища, идти за хлебом, бегать по полям, смеяться про себя, несколько раз в неделю, спотыкаться о пень, шуточки надо мной, издевательство над человеком, не к месту, плакать о нем, следить за собой, не сделать из-за лени, похожий на отца, испытать беду, жить с родителями, заведующий библиотекой, дом в девять этажей, болен экземой, писать по адресу, видел своими глазами, определить по вкусу, разные по цвету, быстрее всех, заболеть гриппом, сидеть за чашкой чаю, дом отца, отказаться от прошлого, разжиться деньгами, забыть о сне, читать про себя, бежать по берегу.

**13. Выпішыце з тэксту словазлучэнні і дайце ім поўную характарыстыку ў наступнай паслядоўнасці:** ***1) пачатковая форма словазлучэння (па пачатковай форме галоўнага слова); 2) простае ці складанае; 3) тып словазлучэння паводле спаянасці кампанентаў: свабоднае, сінтаксічна непадзельнае, несвабоднае; 4) сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі словазлучэння: атрыбутыўныя, аб'ектныя, акалічнасныя (з указаннем значэнняў), суб'ектныя; 5) тып словазлучэння паводле граматычнага выражэння галоўнага слова: іменнае (назоўнікавае, прыметнікавае, лічэбнікавае, займеннікавае), дзеяслоўнае, прыслоўнае; 6) від сінтаксічнай сувязі паміж словамі: дапасаванне (прыназоўнікавае ці беспрыназоўнікавае, моцнае ці слабае), прымыканне.***

Да чаго ж прыгожая вясновая раніца! У паветры яшчэ сыра. На белых ад цвету галінках вішняку вісяць буйныя кроплі начных тумаnoў. На платах і стрэхах ляжыць яшчэ вільгаць, за сялом даволі густа, гучна зеляніцца поле. Загоны перасякаюцца то тонкімі, то шырокімі звілінамі дарог. Хтосьці з нас на пагорку заўважыў гадамі прыгнуты вятрак. Але, здаецца, ён ужо сіліцца ўзмахнуць паднятымі крыламі. Над стрэхамі хат вывіваюцца лёгкія празрыстыя дымкі. За імі па небе такое ж самае злёгку ружаватае воблачка. Здаецца, што яму вельмі нудна быць аднаму на гэтай блакітнай бясконцасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

неба, але запрапасціўся недзе гэты неўгамонны свавольнік-вецер, і яно не можа скрануцца.

(Ян Скрыган)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ